# Гісторыя генацыду ў законе: практыкі юрыдычнага пераследу ў Беларусі 2022

**Дыскусія**
**10 чэрвеня 2022 г.**
**13:00-14:30 (Мінск)**

Дыскусія адбудзецца на беларускай і нямецкай мовах з сінхронным перакладам

ФОРУМ ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ
FORUM FÜR HISTORISCHE BELARUS-FORSCHUNG

У Беларусі былі прынятыя два новыя законы, якія дазваляюць пераследаваць грамадзян з дапамогай дзяржаўнай інтэрпрэтацыі гісторыі. Любыя выказванні аб Другой сусветнай вайне, якія адхіляюцца ад дзяржаўных наратываў, могуць патрапіць пад крымінальнае пакаранне. Гэту спробу пераследу ўдзельнікаў масавага пратэснага руху і незалежных даследчыкаў мы расцэньваем як ідэалагічны адказ беларускай дзяржавы на шырокія пратэсты пасля сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года.

Чаму дзяржаўная гістарыяграфія ўсё яшчэ засяроджана на гвалце, зазнаным пад нямецкай акупацыяй падчас другой сусветнай вайны? Як закон вызначае “генацыд беларускага народу” і “рэабілітацыю нацызму” ў 2022 годзе? Як і чаму дзяржаўная пракуратура вывучае злачынствы супраць яўрэйскага і неяўрэйскага насельніцтва, якія хаваюцца за гэтымі паняткамі, праз восемдзесят гадоў пасля іх здзяйснення? І нарэшце, якія наступствы мае гэты пераслед на навуковую дзейнасць і грамадзянскую супольнасць?

На гэтыя пытанні мы адкажам у межах дыскусіі гісторыкаў з Беларусі і Германіі пра актуальнасць мінулага ў XXI стагоддзі.

### Уступнае слова

**Ян Кузбер**

Нямецкае таварыства па вывучэнні Усходняй Еўропы / Універсітэт імя Гутэнберга, Майнц

### Эксперты

**Фелікс Акерман**

Нямецкі гістарычны інстытут, Варшава

**Аляксей Братачкін**

Еўрапейскі ўніверсітэт Віядрына

**Ірына Кашталян**

Брэменскі ўніверсітэт

### Мадэрацыя

**Аніка Вальке**

Універсітэт Вашынгтона, Сент-Луіс

DGO
Deutsche Gesellschaft für Osteuropakunde e.V.

**Для ўдзелу ў дыскусіі прайдзіце, калі ласка, рэгістрацыю па спасылцы:‘ https://us02web.zoom.us/webinar/register/WN_2DNClwDtQQeFkgpLRtH4kg**